ГОМЕЛЬСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

Аддзел адукацыі, спорту і турызму
Лельчыцкага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Лельчыцкі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі”

**Намінацыя**
**“Народная дэкаратыўна-прыкладная творчасць: традыцыі і сучаснасць”**

# ПРАЕКТ
# “Бортніцтва – гонар Лельчыцкага краю”

**Аўтары:**
**Зуевіч Анастасія, 14 гадоў,**
**Баланчук Алена, 14 гадоў,**
**аб’яднанне па інтарэсах**
**“Масавік-забаўнік”**

**Кіраўнік:**
**Ханчыч Антаніна Раманаўна**

**Лельчыцы**
**2021**

Друкуецца па рашэнні абласнога метадычнага савета ўстановы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны абласны Палац творчасці дзяцей і моладзі” №3 ад 18.01.2022

Праект “Бортніцтва – гонар Лельчыцкага краю” (дэкаратыўна-прыкладная творчасць) / пад кіраўн. А.Р Ханчыч. – Лельчыцы: Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Лельчыцкі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі”, 2021. – 20 с.

Матэрыялы адрасуюцца педагагічным работнікам устаноў адукацыі і іншым зацікаўленым

**Змест**

Пашпарт праекта………………………………………………………… 4

Уводзіны……………………………………………………………………... 5

Этапы рэалізацыі праекта……………………………………………... 6

Даследчая праца…………………………………………………………….. 7

Бортніцтва ў Лельчыцкім раёне…………………………………………… 9

Галоўнае свята пчаляроў……………………………………………… 11

Сустрэча з майстрам па вырабу свечак………………………………… 12

Практычнае прымяненне атрыманых ведаў…………………………... 12

Заключэнне……………………………………………………………………. 13

Спіс літаратуры……………………………………………………………. 14

Дадаткі………………………………………………………………………… 15
Дадатак 1. Тэхналагічная карта №1“Выраб свечкі з воску спосабам макання”……………………………………………………………………….. 15
Дадатак 2. Тэхналагічная карта №2 “Выраб свечкі з воску спосабам адліўкі ў формы……………………………………………………………….. 18

## Пашпарт праекта

| | |
|---|---|
| **Назва праекта** | Бортніцтва – гонар Лельчыцкага краю |
| **Тып праекта** | Даследчы праект |
| **Адукацыйная вобласць** | Дэкаратыўна-прыкладная творчасць |
| **Метады, выкарыстаныя ў праекце** | Наведванне бібліятэкі, Лельчыцкага раённага краязнаўчага музея, дома рамёстваў.<br>Аналіз літаратуры па тэме праекта.<br>Гутарка з мясцовымі бортнікамі і народнымі майстрамі па вырабу свечак.<br>Вызначэнне тэхналогіі вырабу свечак з воску.<br>Сістэматызацыя матэрыялаў, афармленне праектна-даследчай работы.<br>Запіс відэароліка. |
| **Формы прадстаўлення вынікаў праекта** | Дэманстрацыя відэароліка – прэзентацыя праекта.<br>Васкавыя свечкі. |
| **Установы і арганізацыі, ва ўзаемадзеянні з якімі выконваўся праект** | Бібліятэка, Лельчыцкі раённы краязнаўчы музей, раённы дом рамёстваў. |

# Уводзіны

Любоў чалавека да Радзімы ў першую чаргу звязана з родным краем, са сваёй малой радзімай, дзе прайшло яго дзяцінства, з рэчамі, зробленымі рукамі яго продкаў, з песнямі, што спявалі многія пакаленні, з традыцыямі і звычаямі бабуль і дзядуль. Чым ярчэй і змястоўней веды пра родны край, яго людзей, мінуўшчыну і сучаснасць, тым больш эфектыўна будзе вырашацца адна з галоўных задач – выхаванне грамадзяніна-патрыёта.

Добрую магчымасць вывучаць, зберагаць і развіваць культурную спадчыну Беларусі дае ўдзел у праектнай дзейнасці. Таму мы вырашылі распрацаваць праект “Бортніцтва – гонар Лельчыцкага краю”.

Ідэя праекта з’явілася, калі мы разам са сваёй сяброўкай наведаліся да яе бабулі Сініцкай Евы Пятроўны. Гэта вельмі прыемная і ветлівая жанчына пачаставала нас смачным мёдам у сотах. Ад Евы Пятроўны мы даведаліся, што гэты мёд здабыты ў нашым раёне ў вёсцы Лохніца яе стрыечным братам Сініцкім Аляксандрам Цярэнцьевічам. Яшчэ Ева Пятроўна паказала нам прыгожыя васкавыя свечкі, якія яна вырабляе сама.

Тады мы задумаліся, што кожны куток нашай Радзімы багаты на разнастайныя культурныя традыцыі і звычаі, рамёствы і промыслы. Адметнай асаблівасцю нашага Лельчыцкага краю з’яўляецца тое, што тут захаваўся адзін са старадаўніх лясных промыслаў – бортніцтва, які нядаўна атрымаў статус нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі.

Нам захацелася даследаваць, як з’явіўся гэты промысел, хто з’яўляецца яго носьбітам у нашым рэгіёне, якія мерапрыемствы ладзяцца ў гонар гэтага промыслу, а таксама асвоіць тэхналогію вырабу васкавых свечак.

**Мэта праекта:** захаванне самабытнай культуры Лельчыцкага краю шляхам даследавання ляснога промысла – бортніцтва.

**Задачы праекта:**

- пашырыць веды аб традыцыях, звычаях і промыслах сваёй малой радзімы – Лельчыцкага раёна;
- пазнаёміцца з такой нематэрыяльнай культурнай спадчынай, як бортніцтва;
- прыняць удзел у тэматычных сустрэчах з бортнікамі і народнымі майстрамі Лельчыцкага раёна;
- засвоіць тэхналогію вырабу свечак з воску і вырабіць іх сваімі рукамі;
- правесці майстар-клас па вырабу свечак для навучэнцаў аб’яднанняў па інтарэсах цэнтра творчасці;
- запісаць відэаролік.

**Гіпотэза праекта:** вывучэнне і захаванне традыцый, ведаў і тэхналогій, якія перададзены нам продкамі, будуць спрыяць далучэнню да культурнай спадчыны і фарміраванню пачуцця самабытнасці і пераемнасці.

**Этапы рэалізацыі праекта**

| | Змест дзеянняў | Тэрмін |
|---|---|---|
| №п/п | **Падрыхтоўчы этап** | |
| 1.<br><br>2.<br>3.<br>4.<br><br><br><br>5. | Абмеркаванне праблемы.<br>Пастаноўка мэты і задач.<br>Вызначэнне гіпотэзы.<br>Планаванне этапаў працы над праектам.<br>Вывучэнне і аналіз матэрыялаў аб гісторыі ўзнікнення і развіцці бортніцтва, аб майстрах па вырабу свечак.<br>Абагульненне знойдзенага матэрыялу | ліпень 2021 года |
| | **Асноўны этап** | |
| 1.<br><br><br>2.<br>3.<br><br>4.<br>5. | Сустрэчы і гутаркі з бортнікамі і народнымі майстрамі Лельчыцкага раёна.<br>Даследчая праца.<br>Распрацоўка тэхналагічнай карты па вырабу васкавых свечак.<br>Выраб васкавых свечак.<br>Правядзенне майстар-класа па вырабу васкавых свечак. | жнівень – лістапад 2021 года |
| | **Заключны этап** | |
| 1.<br>2.<br><br>3. | Падвядзенне вынікаў.<br>Афармленне праекта “Бортніцтва – гонар Лельчыцкага краю”.<br>Запіс відэароліка. | снежань 2021 года |

## Даследчая праца

Наша работа над праектам пачалася са збору інфармацыі, з вывучэння і аналізу літаратурных крыніц. З энцыклапедыі мы даведаліся, што бортніцтва – лясное пчалярства, заснаванае на ўтрыманні пчол-баровак у штучных дуплах – борцях; адзін з найбольш старадаўніх промыслаў; пачатковая форма культурнага пчалярства [4].

Бортніцтва развілося з дзікага пчалярства (збіральніцтва), калі чалавек выпадкова, а пазней свядома знаходзіў пчаліныя гнёзды ў дуплах дрэў, знішчаў агнём пчол і збіраў мёд. Але яго з цягам часу патрабавалася ўсё больш і больш. І чалавека ўжо перастае цікавіць дзікае паляванне. Часу на гэта траціцца працьма, а здабыча мёду невялікая, рэдка калі пашанцуе. Вось тады чалавек і задумаўся, як бы прыручыць пчол, самому ствараць ім месцы для гнёзд і заваблівацць туды. Тады чалавек ў рэшце рэшт стаў майстраваць у дрэвах дуплы (борці), зрабіўся бортнікам.

Упершыню пра бортніцтва ўспамінаецца ў Х стагоддзі, калі падарожнікі з розных частак свету наведвалі пушчы сучаснай тэрыторыі Беларусі і апісвалі як край, дзе бягуць рэкі мядовыя.

У Х стагоддзі нормы звычаёвага права былі прапісаны ў “Рускай праўдзе” (артукулы, звязаныя з пчоламі, борцямі і знамёнамі) “Аже пчелы выдереть, то 3 гривны продаже, а за медъ, аже будеть пчелы не лажены, то 10 кунъ; будеть ли олекъ, то 5 кунъ”[5].

Ў XVI стагоддзі бортніцтва дасягае ўзроўню абасобленай галіны вялікакняскай гаспадаркі ў Вялікім Княстве Літоўскім і знаходзіцца ў перыядзе залатога веку бортніцтва. Яно пазначаецца на мапах (картах), гравюрах, а таксама сустракаецца ў афіцыйных дакументах. А ў ІІІ Статуце ВКЛ нават займела асобныя артыкулы (Хто бы мелъ споръ о бръти або о входы в пущу; Устава дереву бортному; Цена пчолам; О пущу, о ловы, о дерево бортное, о озера и сенажати), што па тагачасных мерках было вялікім дасягненнем [6].

Класічную форму бортніцтва набывае са з’яўленнем жалезных прылад працы (сякера, плешня), калі бортнік атрымлівае магчымасць выдзёўбваць борці ў сырых ствалах дрэў. Менавіта на беларускім Палессі ўзнік гэты своеасаблівы лясны промысел, які, дзякуючы свайму шырокаму распаўсюджанню і велізарнаму эканамічнаму значэнню, прадвызначыў на некалькі стагоддзяў характар развіцця гэтагаляснога краю.

Развіццю бортніцтва ў Беларусі садзейнічала наяўнасць вялікіх масіваў дрымучых лясоў і пушчаў, густа парослых верасам, малiннікам і іншымі меданоснымі раслінамі. Па берагах рэк, азёр, балот непралазнай сцяной расла вярба, па ўзлесках – ляшчына. Нават у XV– XVI стагоддзях велізарныя тэрыторыі былі яшчэ не абжытыя, а ў многіх месцах наогул не ступала нага чалавека. Першымі асвоілі неабжытыя землі бортнікі. У пошуках прыдатных месцаў для пчалярства яны заўсёды ішлі наперадзе земляроба. Гісторыя захавала імёны беларускіх бортнікаў, якія ў другой палове XV – пачатку XVI стагоддзя прымалі ўдзел у засваенні "нічыйных" падляшскіх земель паміж

рэкамі Нерасля, Чорная і Супрасль. Сярод іх былі суражскія Бортнікі Кузьма Касцяневіч, Кац Бортнік, Сцяцко Саковіч, Верамей Зеласовіч, Фядзько Селівонавіч і інш.[1].

Як самастойны від ляснога промыслу бортніцтва прайшло тры этапы развіцця: ахова і догляд дзікіх пчол у знойдзеных дуплах, свядомае ўтрыманне аселенага рою ў прыстасаваных пад борці натуральных дуплах, развядзенне і ўтрыманне рою ў спецыяльна зробленых борцях.

Для борці выбіралася вялікае дрэва на палянцы, каб яно адусюль было бачна. Найчасцей гэта была сасна. На елцы пчолы не сяліліся, а дуб цяжка апрацоўваўся. Своеасаблівы рытуал суправаджаў бортніка ў час падрыхтоўкі борці: ён не піў, не еў нічога тлустага, трымаў у сакрэце сваю задуму. З паўднёвага боку дрэва на вышыні 6-10 метраў ссякаў палоску шырынёй у 15 і даўжынёй да 70 сантыметраў. Дупло рабіў спецыяльным інструментам такім чынам, каб сценкі былі не таўсцейшыя, як за 10 сантыметраў. Унутр ставіў крыжавіну для падтрымання сотаў, а само дупло націраў духмянымі травамі. Зачынялася борць спецыяльнай дошкай, у якой амаль што пасярэдзіне быў ляток. Каб вецер не зламаў дрэва, вяршыня яго зразалася. На зрэз клалася бяроста і прыціскалася каменем. Ля самой борці да сука прывязвалася калода (самабітка) або пад борцю забіваліся оспы – вострыя дубовыя і металічныя штыры, якія перашкаджалі мядзведзю дабірацца да пчол.

Праца бортніка патрабавала вялікіх практычных ведаў, спрыту і немалой фізічнай сілы. На дрэва ён узбіраўся пры дапамозе спецыяльнай прылады – лезіва. Доўгія гадзіны вісеў так высока над зямлёй, выдзёўбваючы новую борць. Кожная з іх мела свой знак – кляймо або сцяг. Гэты знак высякаўся на ўсходнім баку дрэва на ўзроўні вачэй. Знакі мелі выявы ад простага крыжа да крыжа з хітрымі ўзорамі і абаранялі правы гаспадара на борць. Ва ўладаннях аднаго бортніка было каля шасці дзясяткаў бортных дрэў. У асобных дрэвах мелася па тры, а то і болей борцяў, што асабліва цанілася і з’яўлялася гонарам гаспадара.

Прафесія бортніка перадавалася па спадчыннасці ад бацькі да сына, якога ён з малых гадоў знаёміў з таямніцамі старажытнага рамяства. Напрыклад, каб перасяліць рой у новую борць, ажыццяўлялася абрадавае дзеянне – тварба, куды ўваходзіла інсцэніроўка будучага збору мёду з заклікамі і замовамі, а таксама апырскванне настоем з кветак і траў, абкурванне верасам, націранне. Бортнік вельмі даражыў сваёй прафесіяй і толькі перад смерцю паведамляў свайму пераемніку самыя глыбокія яе таямніцы, вучыў варажыць і перадаваў свой бортны знак [3].



Лясное бортніцтва ўяўляе сабой шырокі пласт навыкаў і практык, якія датычацца толькі гэтага промыслу, бортнікі захоўваюць і выкарыстоўваюць адмысловыя прылады працы (лезіва, пешня, барта, дымар).

Промысел звязаны з паважлівым стаўленнем да акаляючай прыроды, пчол, пэўнымі традыцыямі і рытуаламі (бонда, сябрына, талака, замовы), захоўвае своеасаблівае звычаёвае права ўласнасці на бортнае дрэва, адметныя кулінарныя традыцыі, выкарыстанне пчол і прадуктаў пчалярства ў народнай медыцыне. Бортнікі карыстаюцца інструментамі і рыштункам, якія служылі яшчэ дзядам-прадзедам, а таксама традыцыйнай тэрміналогіяй.



**Бортніцтва ў Лельчыцкім раёне**

У найбольш архаічным варыянце бортніцтва захавалася на тэрыторыі нашага Лельчыцкага раёна. Нават назва нашай мясцовай прыгажуні-рачулкі Убарці звязана з гэтым рамяством. Людзі рабілі і вешалі борці каля ракі, бліжэй да яе. Вось і атрымліваецца, што ў самай борці. Адсюль і Убарць. Яшчэ 100 гадоў таму ледзь не ў кожнай вёсцы нашага раёна былі бортнікі, а ў лясах на старых соснах і дубах стаялі калоды, якія і сёння можна ўбачыць.

Зараз на тэрыторрыі раёна пражывае больш за 100 бортнікаў, якія практыкуюць гэтае рамяства пастаянна, а яго сакрэты традыцыйна перадаюць ад дзеда да бацькі, ад бацькі да сына, ад дзеда да ўнука або ад вопытнага старога бортніка – да маладога спрытнага і фізічна моцнага сваяка ці, у крайнім выпадку, суседа, калі няма каму перадаць навыкі сваім дзецям.

Найбольш вядомыя бортнікі Лельчыцкага раёна – Міхаіл Флёрка з вёскі Сіманіцкі Млынок, Васіль Маркевіч, Рыгор Брылевіч і Уладзімір Лукашэвіч з вёскі Глушкавічы, Адам Восенка з вёскі Новае Палессе, Аляксандр Сініцкі з вёскі Лохніца, Аляксандр Цалка з вёскі Чэмернае.

З некаторымі з іх мы сустрэліся, некаторым патэлефанавалі і змаглі сабраць цікавыя матэрыялы.

Першым нашым субяседнікам быў Рыгор Іванавіч Брылевіч з вёскі Глушкавічы. Вось што распавёў нам аб сваім занятку Рыгор Іванавіч:



"Мы здабываем чысты лясны мёд, без цукру і ўсялякіх дабавак. Але ж, каб усё прайшло бяспечна, патрэбна быць упэўненым у сабе, у дрэве, на якое ўзбіраешся. Дарэчы, што датычыцца вышыні, на якую ставяцца борці, то яна каля 10 метраў. Бортнік стараецца не ўзбірацца ўжо занадта высока. Борці ставяцца на сосны і дубы. Сваё "паляванне" на мёд бортнік пачынае восенню і вясной. Залазіць на дрэва, паддае пчолам "дымку" – і наперад, за сотамі.

Самае галоўнае пад’ёмнае прыстасаванне – “жэнь” альбо “лазіва”. Гэта доўгая вяроўка, з дапамогай якой бортнік лезе на дрэва. Бортніку патрэбна ўмець знаходзіцца на дрэве і пры гэтым не зваліцца на зямлю. А такія выпадкі былі, і часам заканчваліся трагічна. Таму асцярожнасць бортніка корміць.

Для таго, каб пчол заманіць да сябе, у мяне свае сакрэты. Адзін з іх – знутры ў калоду я кладу багон, націраю ім – пах стаіць прывабны ў акрузе. Вешаю таксама соты…

За сезон ў мяне атрымліваецца сабраць ураджай мёду да 50 кілаграмаў. Але ж, многае залежыць ад асяроддзя. У пчол шмат ворагаў. Напрыклад, клешч, матыль. Ёсць прыхільнікі пачаставацца, напрыклад, куніца, якая можа ўсё ў вуллі знішчыць. Тады і ўраджай мёду значна меншы, бо яна бязлітасная…

Бортніцтва – гэта хобі, занятак для душы, які можа прыносіць яшчэ і прыбытак. На першым месцы, каб было жаданне займацца гэтай справай. І яно ў шматлікіх глушкоўцаў ёсць. Метадам спроб і памылак, канечне, атрымліваецца вынік. Я пераняў у бацькі вопыт, дзялюся ім з іншымі. Так карысная справа і жыве”.

Другім нашым субяседнікам быў Аляксандр Паўлавіч Цалка з вёскі Чэмернае, які працуе ў цэнтры творчасці дзяцей і моладзі загадчыкам аддзелу дадатковай адукацыі. Ён спадчынны бортнік, прытрымліваецца традыцый свайго дзеда і бацькі, якія перадалі яму свой вопыт і зпакінулі ў спадчыну 30 борцей. Якую зараз колькасць борцей мае, ён дакладна не назваў. Гаворыць, што ў вёсцы так ніхто не робіць. Такія традыцыі, мясцовыя звычкі – трымаць у тайне колькасць борцей.



Борці свае Аляксандр Паўлавіч ставіць у розных месцах. Ёсць блізка каля дома, а ёсць і на адлегласці 10 кіламетраў. Адзін раз на тыдзень неабходна рабіць аб’езд, каб паглядзець, ці няма якіх насякомых, ці не пашкоджаны непагаддзю борці. Таму гэтая праца патрабуе немалой фізічнай сілы, вялікіх практычных ведаў і спрыту. Залезці на дрэва – злезці, і так некалькі разоў на дзень – справа нялёгкая...

Галоўнымі памошнікамі для Аляксандра Паўлавіча з’яўляюцца яго брат Сяргей і старэйшы сын Максім. Як некалі ў дзяцінстве ён дапамагаў свайму бацьку, так зараз Максім дапамагае яму, то вядро падасць, то дымар.

Аляксандр Паўлавіч лічыць, што бортніцтва – гэта справа адказная, няпростая, але ж, вельмі цікавая і яшчэ ён вельмі задаволены тым, што яе пераймае яго сын.

Наш наступны субяседнік – Уладзімір Мікалаевіч Лукашэвіч. Уладзімір Мікалаевіч ведае пра мёд і асаблівасці яго здабывання шмат чаго. У гэтай справе ён, як рыба ў вадзе. Пра свой натурпрадукт ён распавядаў з лагодаю і любоўю: там не тое, што ўсе травы – уся прырода.



І яшчэ мы даведаліся, што мёд з борцей – самы карысны, і самы натуральны, таму што робяць яго пчолы з ляснога разнатраўя. Без мёду ў нас усё роўна, што без бульбы – проста немагчыма абысціся. Бо гэта і лекі, і ласунак, і смачны дадатак да выпечкі. Сваім палескім мёдам Уладзімір Мікалаевіч частуе ўсіх родзічаў.

Калі мы збіралі матэрыял пра бортнікаў нашага раёна, то даведаліся што ў Глушкавічах, Прыбалавічах, Мілашавічах, Баравым ёсць цэлыя сем'і, у якіх займаюцца гэтым даволі старым промыслам. Ён эвалюцыянуе на сучасны лад, прычым без пашкоджання сувязі з мінулым. Дарэчы, дзякуючы бортнікам з Лельчыцкага раёна, старажытны промысел трапіў у Сусветны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. А яшчэ раней, у 2017 годзе, элемент "ляснoе бортніцтва" стаў часткай нематэрыяльнай спадчыны Беларусі. І гэтая падзея выклікае гонар за нашых землякоў – бортнікаў.



**Галоўнае свята пчаляроў**

Адметнай з'явай з'яўляецца і тое, што ў нашым раёне ўся традыцыйная культура звязана з мёдам, воскам, пчалой. "Пчолкі… Гэта мая худобіна…", – словы, сказаныя з пэўнай доляй гумару бортнікамі, якія клапоцяцца пра маленькіх крылатых істот. З раніцы да вечара аглядаюць пчальнікі: здымаюць "крышкі", дастаюць рамкі: а ці здаровыя пчолкі? Ці не заляцелі матыліцы? А мо пара спрабаваць мёд? Так, пчолы ствараюць не толькі карысныя прадукты харчавання ды лекі, апыляюць кветкі, але ж і дораць нам радасць усведамлення: які цудоўны свет навокал [3]. Таму ў 2018 годзе ААН аб'явіла пра святкаванне Сусветнага дня пчалы. Свята адзначаецца 20 мая.

А ў маі 2019 года ў аграгарадку Сіманічы адбылося свята "Мядовы фальварак". На свята былі запрошаны старшыня Лельчыцкага раённага Савета дэпутатаў Таццяна Беспалая, госці: кіраўнік установы традыцыйнага бортніцтва "Братэрства босых бортнікаў", член Студэнцкага этнаграфічнага таварыства, акрэдытаванага ў ЮНЭСКА, Іван Осіпаў, грамадскі эксперт у галіне нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі Рэгіна Гамзовіч, вядомы беларускі фотамастак, член праўлення народнага фотаклуба "Мінск"Альфрэд Мікус, вялікая колькасць мясцовых бортнікаў і іх сямей з усяго раёна. На

плошчы аграгарадка было размешчана тэматычнае подвор’е “Падворак пчаляра”. У майстэрні “Творчы вулік” праходзілі майстар-класы бортнікаў, масцяроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва па разьбе па дрэве, саломапляценні, вышыўцы, вырабу свечак і г.д. На выставе-дэгустацыі ўсіх гасцей частавалі стравамі традыцыйнай беларускай кухні на падставе мёду. Таксама была афармлена тэматычная выстава “Кніжныя соты”, прадстаўлены работы конкурса дзіцячага малюнка “Залатая пчолка”, а калектывы мастацкай самадзейнасці дарылі музычныя падарункі.

Хочацца адзначыць, што ў гонар пчаляроў-бортнікаў па ўсёй Беларусі ладзяцца разнастайныя мерапрыемствы, фестывалі. І гэта нездарма. Таму што бортнікі, на наш погляд, незвычайныя людзі, гэта асобы пласт носьбітаў культуры, якія сустракаюцца на Беларусі.

**Сустрэча з майстрам па вырабу свечак**

Варта адзначыць, што бортніцтва – гэта не толькі атрыманне мёду ад дзікіх пчол. Гэты промысел, напрамую звязаны таксама з вытворчасцю прапалісу і воску, мае сувязь з многімі мясцовымі традыцыямі і рытуаламі.

Пры сустрэчы з майстрам па вырабу васкавых свечак Сініцкай Евай Пятроўнай мы даведаліся, што пчаліны воск з’яўляецца вельмі каштоўным рэчывам прыроднага паходжання з масай унікальных уласцівасцей. Зробленыя з яго свечкі валодаюць прыемным залацістым колерам і цёплым натуральным мядова-кветкавым водарам. Гараць яны нашмат даўжэй за парафінавыя. А яшчэ, па даўняй традыцыі, выробленыя з воску свечкі, асвячаліся ў царкве на свята Маці Божай Грамнічнай (Стрэчанне) і называліся “грамнічнымі”. Гэтыя свечкі людзі выкарыстоўвалі на працягу года на ўсе выпадкі жыцця: ці то вяселле, ці то пахаванне, ці проста пад час малітвы.



**Практычнае прымяненне атрыманых ведаў**

Абмеркаваўшы і асэнсаваўшы атрыманую інфамацыю, намі было прынята рашэнне прымяніць атрыманыя веды на практыцы і самім вырабіць свечкі з воску.

Перш чым прыступіць да вырабу свечак, нам патрэбна было адказаць на пытанні: “Якім спосабам будзем вырабляць свечкі?” “Якія матэрыялы і інструменты прымяняюцца пры вырабе свечак”, “Якія меры бяспекі трэба захоўваць?”.

Ад Евы Пятроўны мы даведаліся, што існуюць некалькі спосабаў вырабу свечак. Першы спосаб заключаецца ў тым, што свечкі катаюць з лістоў вашчыны, другі спосаб – у маканні кната ў расплаўлены воск датуль, пакуль не

атрымаецца свечка патрэбнай таўшчыні. А трэці спосаб складаецца ў выкарыстанні рознага выгляду формаў для адліўкі свечак.

Для вырабу нашых свечак мы вырашылі прымяніць спосаб макання кната ў расплаўлены воск. Асноўнымі матэрыяламі і інструменамі для вырабу свечак гэтым спосабам з’яўляюцца: пчаліны воск, баваўняныя ніткі, рондаль для вадзяной лазні, ёмістасць для расплаўлення воску, форма для расплаўленага воску, алюміневы кручок для мацавання knatoў, нацягнутая вяроўка для сушкі свечак.

Пры вырабе свечак патрэбна захоўваць пэўныя меры бяспекі. Асноўнай мерай бяспекі з’яўляецца кантроль тэмпературы плаўлення воску. Патрэбна ведаць, што воск плавіцца пры тэмпературы 60-70 градусаў. Нельга павялічваць тэмпературу. Забараняецца таксама ліць у воск ваду, гэта можа прывесці да яго распрысквання. Патрэбна таксама ведаць, што воск гарыць так, як і алей, таму вадой тушыць яго нельга. Самым небяспечным спосабам плаўлення воску з’яўляецца вадзяная лазня.

Далей з дапамогай мясцовых майстроў мы распрацавалі тэхналагічную карту (Дадатак 1), якая вельмі дапамагла нам у працэсе вырабу свечак.

Нарэшце мы дасягнулі галоўнай мэты нашай практычнай дзейнасці – вырабілі свечкі сваімі рукамі з цёплым натуральным мядова-кветкавым водарам. Вельмі прыемна было трымаць іх у руках, таму што выраблены яны з экалагічнага прыроднага матэрыялу.



Работа па вырабу свечак даставіла нам велізарнае задавальненне. Мы змаглі дакрануцца рукамі да таго, што спрадвек рабілі нашы продкі, пазнаць іх вопыт.

## Заключэнне

У выніку можна адзначыць, што работа над праектам “Бортніцтва – гонар Лельчыцкага краю” не толькі ўзбагаціла нашы веды пра бортніцтва, яго развіццё ў нашым раёне, але і паспрыяла далучэнню да культурнай спадчыны і фарміраванню пачуцця самабытнасці і пераемнасці.

Мы, удзельнікі праекта, навучыліся сістэматызаваць веды і прымяняць іх на практыцы, засвоілі тэхналогію вырабу свечак з воску, правялі майстар-клас па вырабу свечак для навучэнцаў аб’яднанняў па інтарэсах цэнтра творчасці.

Пад час даследчай працы мы яшчэ раз пераканаліся што бортніцтва ў Лельчыцкім раёне – гэта багацце і традыцыі нашых людзей, гэта іх лад жыцця. Гэта вельмі цікавы, незвычайны, унікальны промысел. І вельмі прыемна, што гэты промысел застаецца і па сённяшні дзень актуальны, што сямейныя традыцыі падтрымліваюцца і перадаюцца маладому пакаленню.

Работа над праектам дапамагла нам захаваць веды і тэхналогіі, перададзеныя продкамі. А знаёмства з народнымі традыцыямі, абрадамі, рамёствамі і промысламі яшчэ больш узбагаціла нас духоўна. Дык давайце ж захоўваць, зберагаць і развіваць культурную спадчыну Беларусі!

## Спіс літаратуры

1. Бабіч, А. Ю. Пчалярства як культурная форма лесакарыстання беларусаў у XX – пачатку XXI стагоддзя. А.Ю. Бабіч// Веснік Палескага дзяржаўнага ўнівесітэта. Сер. Грамадскіх і гуманітарных навук: навукова-практычны часопіс. – Пінск: ПалесГУ, 2012. – №2.

2. Народная культура Беларусі / укл. Л.Ф.Анцух. – Мінск: чатыры чвэрці, 2019. – 256 с. (Серыя “Культурная спадчына Беларусі”) В.С. Цітова. – Мінск: БелЭн, 2002.

3. Бортніцтва – сувязь часоў / Р.С. Гамзовіч, І. Дз. Восіпаў, Л.Ф. Анцух; укл. Л.Ф. Анцух. – Мінск: Чатыры чвэрці, 2020. – 250 с. (Серыя “Культурная спадчына Беларусі”).

4. Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя / Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск, 1989.

5. Гурков, В.С. Бортничество в Белоруссии / В.С. Гурков, С.Ф. Терёхин. – Мінск : Полымя, 1980.

6. Борніцтва Палесся [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://bel.sputnik.by/20210510/Bortntstva-Palessya--spse-YuNESKA-lepshyya-fota-tysyachagadovay-tradytsy-1046433046.html. – Дата доступа: 05.01.2022.

Дадатак 1

**Тэхналагічная карта №1**
**“Выраб свечак з воску спосабам макання”**

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Спачатку падрыхтуем кнот.<br><br>Возьмем баваўняныя ніткі даўжынёй 25 см. |  |
| 2. | Зробім пятлю. |  |
| 3. | З алюміневай провалакі зробім кручкі. |  |
| 4. | Надзяваем кнот на алюміневы кручок .<br><br>Кнот гатовы. |  |
| 5. | Далей пачынаем падрыхтоўваць воск.<br><br>Для таго, каб воск хутчэй раплавіўся, яго можна нарэзаць дробнымі брусочкамі або нацерці на тарцы. |  |

| | | |
|---|---|---|
| 6. | Емістасць з воскам змесцім на вадзяную лазню.<br><br>Разаграваем воск на павольным агні. |  |
| 7. | Бярэм форму і заліваем туды воск. |  |
| 8. | Бярэм кнот і макаем яго ў форму з воскам. |  |
| 9. | Затым вешаем для высыхання. І так будзем макаць да патрэбнай нам таўшчыні свечак. |  |
| 10. | А зараз, пакуль свечкі яшчэ цёплыя, патрэбна іх выкачаць, каб яны былі роўныя. |  |

| | | |
|---|---|---|
| 11. | Адразаем кручкі на свечках. |  |
| 12. | Нашы свечкі гатовы. |  |

Дадатак 2

## Тэхналагічная карта №2
## “Выраб свечак з воску спосабам адліўкі ў формы”

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Падрыхтуем формы для свечак.<br>Гэта могуць быць шкляначкі ад ёгурта, сіліконавыя шкляначкі для выпечкі і розныя фігурныя ёмістасці, якія потым можна будзе разрэзаць |   |
| 2. | Бярэм кнот і замацоўваем яго на палачцы, размешчанай папярок адтуліны формы |  |
| 3. | Разплаўлены воск павольна заліваем на дно формы і чакаем, калі ён застыне, каб кнот замацаваўся<br><br>Далей даліваем воск да краёў<br><br>Пакідаем форму для застывання на некалькі гадзін. |  |
| 4. | Адразаем кнот ад палачкі.<br><br>Далей разразаем форму і дастаём свечку. |  |
| 5. | Свечка гатова! |  |

# Для запісаў



*“Асаблівасць спадчыны ў яе двухадзінстве.*
*У яе два цэнтры, два берагі, два адлікі:*
*адзін у мінулым, якое ўсё больш становіцца даўнінай,*
*другі – у сучаснасці, якая ўсё больш становіцца*
*будучыняй”.*

**Алесь Разанаў**